Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 26 (535) Субота, 21 верасня 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

## Родны Мінск, цаліннікі цябе вітаюць! З перамогаю яны вярнуліся з Уральшчыны!

Я часта ўспамінаю 1958 год. Какчэтаўская вобласць. Цаліна. Цёплая летняя ноч. І карагод агней у стэпу. Наша брыгада першай у саўгасе заканчвала ўборку. І на апошнім невялічкім участку зямлі сабралася ўся тэхніка брыгады: больш 10 трактараў, столькі ж камбайнаў, машыны, што адвозілі збожжа, машыны кіраўнікоў саўгаса і раёна. У захапляючым танцы кружыліся дзесяткі агней На тварах камбайнераў, трактарыстаў, шафёраў ззялі такія радасныя, шчаслівыя ўсмешкі, што ад іх станавіўся яшчэ святлей цалінны стэп. Чэснае слова, гэтага не забудзеш ніколі.

# Мы зноў гатовы ў шлях далёкі

І ў сераду, калі Прывакзальная плошча і перон вакзала былі заліты морам святла, я зноў успомніў мой 1958 год. Няхай замест фар камбайнаў, трактараў, аўтамашын тут ззялі юпітэры тэлебачання і кіназдымкі, няхай замест рокату матораў грымеў аркестр, няхай замест штурвала юначыя рукі ўспамінаюць кельму, гэта зноў было свята ўраджаю. Ураджаю ўсмешак, дружбы, гарачых сэрцаў.

У гэты вечар ні адзін чалавек з тых, хто быў на мінскім вакзале, не мог застацца раўнадушным. Нельга вымераць сілу натхнення, ахапіўшага кожнага. Ад хвалявання губляліся словы, якія хацелася б сказаць сваім сябрам, блізкім.

На мітынгу, што адбыўся тут жа, на Прывакзальнай плошчы, выступілі прадстаўнікі студэнцкіх цалінных будаўнічых атрадаў некалькіх беларускіх ВНУ. Яны далажылі, што заданне, якое давала ім Беларусь перад ад'ездам ва Уральскую вобласць, паспяхова выканана і перавыканана.

Будаўнічыя аб'екты здадзены ў эксплуатацыю з гарантыйным пашпартам на два гады. У новых школах, пабудаваных беларускімі камсамольцамі, ужо ідуць першыя урокі. У новых бальніцах людзі ў белым прымаюць хворых. А колькі сем'яў справілі наваселле ў гэтае лета! Не пералічыць усіх добрых спраў нашых студэнтаў на цаліне. Не толькі будынкі ў памяць аб сабе пакінулі на цаліне студэнты. Зерні дружбы паміж моладдзю Беларусі і Казахстана даюць добрыя ўсходы. І нездарма на мітынгу сустрэчы цаліннікаў прагучалі такія гарачыя словы: «Мы вярнуліся ў родны Мінск. Нас чакае ўпартая вучоба, новыя веды Але ведай, цаліна: калі ты зноў паклічаш нас, мы прыдзем табе на дапамогу. Мы зноў гатовы ў шлях далёкі!..»

**Я. ЛЯХАЎ.**



Універсітэцкі гарадок

## *На Дзвіне*

Яшчэ ў мінулым навучальным годзе на лекцыях мы ўяўлялі сабе тую нязведаную і захапляючую практыку па геалогіі, якая чакала нас улетку.

І вось ззаду ўсе залікі і экзамены. Мы ў шляху на Заходнюю Дзвіну.

Лагер разбілі на маляўнічым беразе ракі, воды якой перакатваючыся праз парогі, шумна нясуцца да Балтыйскага мора. Раніцай малочны туман разрываецца хрыплымі гудкамі катэраў, што, як неўгамонныя мурашкі, буксіруюць сотні кубаметраў лесу для новабудоўляў рэспублікі. Побач з лагерам чуваць прыглушаныя выбухі і мерны рокат працуючых у кар'еры экскаватараў. Ідзе здабыча даламітаў—неабходнай сыравіны для будаўніцтва. Праходзім па дарозе, па якой МАЗы, падобныя да сваіх братоў зубраў, паўзуць угару. Вадзіцелі ўсміхаюцца—выгляд жа ў нас амаль вопытных геолагаў! У кожнага за плячыма рукзак з узорамі, а ў руках доўгія геалагічныя малаткі, якімі мы. асабліва ў першы час, стараліся пабольш стукаць па вялізных валунах, быццам ад гэтага нам станавілася больш вядома аб паходжанні ці аб абсалютным узросце пароды.

Мы зышлі ўніз да ракі і спыніліся там, дзе пласты даламітаў выходзяць на паверхню. На першы погляд, у іх няма нічога асаблівага. Але прыглядзеўшыся, бачым і ўяўляем гісторыю фарміравання гэтай мясцовасці, яе рэльеф і іншыя асаблівасці, якія для нас, студэнтаў-геог[illegible]аў, маюць асаблівую ка[illegible]насць у пазнанні такой цікавай навукі, як геалогія.

Нам вельмі не хацелася пакідаць цудоўныя мясціны, дзе мы ўведалі шмат новага і карыснага для далейшага вывучэння навукі аб Зямлі.

**Н. СУШКЕВІЧ,**
**Е. ТАРЛЕЦКІ,**
студэнты 2 курса геаграфічнага факультэта.

## ПА УНІВЕРСІТЭТУ

У Мінску некалькі дзён гасцілі кіраўнікі дзяржаўнай камісіі па справах моладзі Фінляндыі Пааво Куоосванен, Венні Маунула і Тайста Кяркяйнен, якія прыбылі ў Савецкі Саюз для перагавораў у Камітэце маладзёжных арганізацый СССР аб праграме дня дружбы савецкай і фінскай моладзі, які адбудзецца 24 лістапада 1963 г. 10 верасня фінскія госці наведалі наш універсітэт.

* * *

Больш 30 супрацоўнікаў матэматычнага факультэта і вылічальнага цэнтра пабывалі днямі на экскурсіі ў Яснай Паляне.

* * *

Камітэт ДТСААФ універсітэта аб'явіў набор слухачоў у аўтамабільны і матацыклетны гурткі. Арганізацыйны сход гуртакоўцаў адбудзецца 24 верасня а 18 гадзіне ў 55 аўдыторыі хімічнага корпуса.

## *Бывай, Ленінград!*

Вось і настаў час развітання. З пачуццём невыказнай радасці і гордасці глядзім мы на горад, які так моцна палюбіўся нам. Вельмі шкада, што так хутка праляцелі дні экскурсіі. Стараемся быць вясёлымі, гэта не ўдаецца, у кожнага ў вачах незатоены сум.

А светлая паўночная ноч, якая гаспадарыць там усё лета, ціха ахутала наваколле. Хвалюецца неўгамонная Нява, над каналамі лёгкай дымкай павісае туман. Казачнымі волатамі ўзнімаюцца Ісакіеўскі сабор, Петрапаўлаўская крэпасць. Бы пачэсны вартавы, застыў у суровым маўчанні крэйсер «Аўрора». Перад вачыма адзін за адным праплываюць усё новыя малюнкі начнога Ленінграда. А ў памяці ўзнікаюць і іншыя. Вось промні заходзячага сонца жартуюць з пазалочанымі прыгажунамі-шпілямі, высока ўзнятымі над непрыступным у сваёй веліччы горадам. Вось дзівосныя палацы—нямыя сведкі стагоддзяў — тонуць у зеляніне паркаў. Глядзіцца ў люстра Нявы Зімні. Ён ганарыцца тым, што трымае ў сябе незлічоныя духоўныя скарбы. Нібы зачараваныя, хадзілі мы па залах Эрмітажа.

Волатаўская постаць Меднага конніка вечна імчыцца ўперад, да Нявы.

Паўстае ў памяці гарадок Пушкіна, дзе стаіць гэты дарагі помнік — ліцэй. Прыціхшыя мы стаім у зале, дзе ў час экзамена чытаў паэт свае Успаміны. Мы перажылі там перыяд эпохі, мы былі яго сучаснікамі.

Не выкажаш пачуцці, што ахапілі нас, калі мы апынуліся ў кватэры вялікага паэта. Вось мы ў кабінеце, ля рабочага стала. разглядаем разложаныя лісткі. спісаныя хуткім почыркам. І, здаецца, вось-вось павінен вярнуцца гаспадар да гэтага стала.

Не хапае слоў, каб выказаць нашы ўражанні. Мы вельмі ганарымся, што ўбачылі горад-святыню. Мы пакінулі Ленінград, але ніколі ў жыцці не забудзем яго.

**Марыя ЛАЗОЎСКАЯ,**
студэнтка 4 курса філалагічнага факультэта.

## ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

## *За далёкімі гарамі?*

Нас не раздзяляюць пустыні і акіяны. Непраходныя балоты не перагароджваюць нам дарогу. Але спытайце студэнта з ліку юрыстаў і філолагаў, што робяць іх сабраты фізікі або якая падзея хвалюе гісторыкаў, матэматыкаў, ён у адказ здзіўлена пацісне плячыма.

А сакрэт гэтага неўразумення просты. Справа ў тым, што студэнты нашага універсітэта займаюцца ў розных карпусах. Але большай часткі навучаючыхся «пашанцавала». Яны аб'яднаны сценамі, а з юрыстамі і філолагамі складаней. Іх вучэбны будынак знаходзіцца на Чырвонаармейскай, і таму жывуць яны, як у вотчыне. Ні яны ні аб кім не ведаюць, ні аб іх ніхто не ведае. А універсітэт жа адзін!

Камсамольскай арганізацыі універсітэта ўзяць бы ды падумаць над пытаннем, як зрабіць, каб не адчувалі сябе пасынкамі студэнты гумкорпуса.

Чаму б не прыйсці, скажам, матэматыкам да юрыстаў, расказаць, што новага на іх факультэце, спець свае любімыя песні, паспрачацца аб новых вершах, патанцаваць. А ці не знойдуць агульную мову журналісты з біёлагамі, фізікамі? Часам справа даходзіць да смеху, некаторыя студэнты-матэматыкі не ведаюць нават, што недзе існуе такі гуманітарны корпус. А ён ёсць, і не толькі будынак, ёсць яшчэ тысяча шукальных, дапытлівых, якія не жадаюць жыць па прымаўцы: «Мая хата з краю».

І няхай падумаюць факультэцкія камітэты камсамола, як лепей зрабіць, каб жыццё студэнтаў розных факультэтаў не заставалася глыбокай тайнай адзін для аднаго.

**С. КУСАВА.**

*Ад рэдакцыі: Мы друкуем пісьмо студэнткі філалагічнага факультэта С. Кусавай слова ў слова, як яна сама напісала. Спадзяёмся, што студэнты кожнага з васьмі факультэтаў нашага універсітэта не застануцца абыякавымі да пытанняў, якія ўзнімае Кусава. Чакаем вашых пісем, сябры!*



800 студэнтаў нашага універсітэта скора справяць наваселле ў у гэтых новых, пабудаваных у сучасным стыле інтэрнатах.

Фота **Я. КАРПІНЧЫКА.**

# ДЗЕНЬ ДОБРЫ, СТУДЭНЦКАЕ ЖЫЦЦЁ!

## Слова—першакурснікам

### Маё вялікае шчасце

Далёка ззаду засталіся хваляванні. Нават не верыцца, што цяпер я студэнтка адной з буйнейшых навучальных устаноў Беларусі. Я так марыла паступіць ва універсітэт! Гэта было самым вялікім і гарачым жаданнем у маім жыцці. Успамінаю, як старанна рыхтавалася дома да уступных экзаменаў і казачных летніх вечароў не бачыла, начэй недасыпала. Сяброўкі, бывала, прыдуць да мяне і здзіўляюцца:

— Хопіць, Галя, табе зубрыць. Пойдзем на вечарынку.

Але дзе там? Ці ў галаве будуць танцы, калі стаіш на пўдарозе і твая мара яшчэ не здзейснілася, калі ты адчуваеш, што ведаў для паступлення ва універсітэт яшчэ малавата. І зноў напружаныя вечары, зноў чытанне...

А якое ўражанне было, калі я ўвайшла ўпершыню ў галоўны корпус універсітэта! Тады мяне ахапіла яшчэ большае жаданне сюды паступіць. А колькі хваляванняў было на ўступных экзаменах! Хоць і ведала матэрыял (рыхтавалася ж!), а ўсё ж было неяк не па сабе. Асабліва уздзейнічалі ўрачыстыя абставіны, яны прыбаўлялі адказнасці, надавалі нябачную сілу.

І вось я студэнтка. Дзесяць разоў перачытвала ў спісу паступіўшых сваё прозвішча, вачам не верыла, што залічана. І пэўна не менш мяне ўзрадавалася мая маці.

Памятаю словы рэктара Антона Нікіфаравіча Сеўчанкі на вечары сустрэчы студэнтаў старэйшых курсаў з першакурснікамі: «Паступленне ва універсітэт — гэта вялікае шчасце для кожнага студэнта. Беражыце яго».

**Галіна ШМЫГІНА,**
студэнтка 1 курса філалагічнага факультэта

### Я ганаруся

Матэматыкай я захапіўся яшчэ з малодшых класаў школы. Вучыўся я ахвотна, але не заўсёды хапала ўпартасці атрымліваць добрыя адзнакі. А вось па матэматыцы ў мяне заўсёды было «4» і «5».

Хутка праляцелі 10 гадоў вучобы ў школе, і вось ужо ў маіх руках атэстат сталасці. Першай маёй думкай было ісці вучыцца далей. Марай маёй стала вучоба ва універсітэце, на матфаку. Але я адчуваў, што ў ведах маіх яшчэ ёсць прабелы. Рашыў папрацаваць, нагнаць упушчанае па сваёй няўбайнасці ў школе.

Працуючы піянерважатым, я разам з тым працаваў над сабой. Прайшло тры гады пасля заканчэння школы, і вось я ў Мінску. З нецярпеннем чакаў вынікаў уступных экзаменаў. І калі атрымаў выклік, быў ад шчасця на сёмым небе. Вось ужо тры тydні, як я студэнт БДУ.

Так, вучыцца тут я лічу вялікім шчасцем. Не перадаць тых пачуццяў, якія я адчуваў, калі ішоў на першую лекцыю. І цяпер, крочачы раніцай на лекцыі, на якіх з кожным днём адкрываецца для мяне ўсё новае і новае, я бязмежна ганаруся, што мне прадастаўлена магчымасць вучыцца ў нашым універсітэце.

**Леанід АСТРЭЙКА,**
студэнт 1 курса матэматычнага факультэта.

### Агульная радасць

Двойчы я падавала заяву аб паступленні ва універсітэт. Летась мне не пашанцавала — не прайшла па конкурсу. Але ж мара! Яна прывяла мяне ў БДУ імя У. І. Леніна. і сёлетняя старанная падрыхтоўка да ўступных экзаменаў не прапала дарэмна. Цяпер я студэнтка біялагічнага факультэта. Біёлаг. У гэтым слове і мая рамантыка, і шчасце, і лёс. Гэтае слова стала радасцю майго жыцця.

Яшчэ ў школе біялогія была маім самым любімым прадметам. Я заўсёды старанна вывучала фізіялогію жывёлін і раслін, будову клетак. Урокі біялогіі заўсёды прыносілі мне вялікае задавальненне.

А ва універсітэце першыя ж лекцыі, якія я праслухала, ужо раскрываюць вялікія далягляды. І радасна становіцца на душы, што атрымліваеш веды, якія дае табе Радзіма, партыя! А мы ў сваю чаргу, вывучыўшыся, усе свае старанні, увесь багаж навукі будзем аддаваць народу.

Паступленне ў вышэйшую навучальную ўстанову — вялікая падзея ў жыцці любога чалавека.

Мая вучоба ва універсітэце — гэта не толькі мая асабістая радасць. Гэта радасць і маіх бацькоў, сясцёр, сяброў, хто праводзіў мяне, жадаючы поспехаў у навуцы і шчаслівага шляху ў жыцці. Гэта радасць агульная і таму, што веды, атрыманыя тут, пойдуць на дасягненне агульнай мэты — пабудову камунізма ў нашай краіне.

**Лідзія БУСЕЛ,**
студэнтка 1 курса біялагічнага факультэта.



Першакурснікі. Фотаэцюд І. Грухана.

### Чэмпіянат першакурснікаў

Закончылася 3 першынство першых курсаў універсітэта па рускіх шашках. Званне чэмпіёна заваяваў матэматык Наум Авербух, які набраў 9 ачкоў з 11 магчымых. Ён выканаў норму 2 разрада.

На паўтара ачка менш у фізікаў В. Стосуя і А. Урбановіча. Па 6 ачкоў набралі Ж. Ламаносаў (гістфак) і В. Хіхіч (геафак). На 6 месцы з 5,5 ачка А. Місуноў (гістфак). Усе яны выканалі норму 3 разрада.

Шмат добрых шашыстаў прыйшло да нас на першы курс. Гэта першаразрадніца, чэмпіёнка СССР мінулага года сярод дзяўчат Л. Соркіна, другаразраднікі В. Пяршукевіч, В. Відмант, А. Даубар і іншыя. Хочацца пажадаць ім вялікіх творчых поспехаў.

У сераду, 25 верасня, пачнецца 3 камандное першынство першых курсаў. Састаў кожнай каманды: 4 мужчыны і 1 жанчына. Кожны курс мае права выстаўляць любую колькасць каманд. Да новых сустрэч за шашачнай дошкай!.

**Генадзь ДРАБУШЭВІЧ,**
кандыдат у майстры.

---

Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна

**АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СЛУХАЧОЎ**

НА ВЯЧЭРНІЯ КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА УСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ ВА УНІВЕРСІТЭТ

На курсы прыміма[illegible]ца асобы, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю і працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі і культуры, а таксама дэмабілізаваныя з Узброеных Сіл СССР.

Перавагай пры залічэнні на курсы карыстаюцца асобы, рэкамендаваныя прадпрыемствам (установай) на вучобу ва універсітэт.

Заняткі на курсах праводзяцца ў вячэрні час, без адрыву ад вытворчасці. Курсы платныя.

Заявы з указаннем выбранай для навучання спецыяльнасці падаюцца на імя рэктара універсітэта.

Да заявы прыкладаюцца наступныя дакументы: характарыстыка, падпісаная адміністрацыяй і кіраўніцтвам грамадскіх арганізацый; копія дакумента аб сярэдняй адукацыі; выпіска з працоўнай кніжкі, завераная аддзелам кадраў (дэмабілізаваныя з Савецкай Арміі прад'яўляюць ваенны білет).

Прыём заяў — да 25 верасня 1963 г. Пачатак заняткаў—з кастрычніка.

Дакументы падаваць асабіста па адрасу: **Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 229-ы пакой (2-і паверх).**

---

## *Хвалюючая, традыцыйная*

РЭПАРТАЖ

Прасторная актавая зала універсітэта... Часта сюды збіраюцца студэнты, аспіранты, навуковыя работнікі, каб адзначыць юбілей ці ўрачыстае свята, правесці агульнауніверсітэцкі партыйны або камсамольскі сход, арганізаваць навуковую канферэнцыю ці дыспут, нарэшце, паслухаць канцэрт класічнай музыкі.

Сёння ж у зале льецца другая музыка — музыка юнацтва, жыццёрадасная, бадзёрая, хвалюючая. Сюды з букетамі кветак у руках прыйшлі першакурснікі, якія толькі што сталі студэнтамі, сустрэцца з прафесарска-выкладчыцкімі работнікамі, са студэнтамі старэйшых курсаў. На іх тварах радасныя ўсмешкі. Яны шчаслівыя, што вытрымалі конкурсныя экзамены і пераступілі парог храма навукі.

Да трыбуны падыходзіць рэктар універсітэта акадэмік А. Н. Сеўчанка. Пад буру апладысментаў ён шчыра і горача віншуе юнакоў і дзяўчат з пачаткам шчаслівага студэнцкага жыцця. Вялікае шчасце, гаворыць ён, вучыцца ў такой выдатнай вышэйшай навучальнай установе, як наш Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна. Я зайздрошчу вам, бо трыццаць год назад, калі я быў студэнтам, нам даводзілася вучыцца ў куды горшых умовах. Да вашых паслуг — прасторныя лекцыйныя аўдыторыі, лабараторыі, майстэрні, бібліятэка. Вас будуць выхоўваць прафесары, дацэнты, высокакваліфікаваныя выкладчыкі. Вучыцеся, дзярзайце, штурмуйце вяршыні навукі. Будзьце вартымі гэтага гонару, маладыя будаўнікі камунізма!

І зноў грыміць зала ад воплескаў юначых рук.

Затым хвалюючую прамову гаворыць прафесар І. Р. Некрашэвіч. Ён параўноўвае студэнтаў-першакурснікаў з альпіністамі, якім прадстаіць узняцца на горную вяршыню. Вяршыня высокая, ззяючая. Нялёгка туды дабрацца. І ўзнімаюцца толькі мужныя, працалюбівыя, нястомныя. Толькі ёсць адна істотная розніца паміж альпіністамі і студэнтамі. Альпініст, узняўшыся на гару, абавязкова спускаецца ўніз, долу. Чалавек жа навукі, раз узняўшыся да вяршыні, ужо можа ніколі не спусціцца ўніз і ўсё жыццё да апошніх дзён аглядаць шырокія далягляды культуры, навукі, жыцця. У імя штурму гэтай вяршыні прафесар заклікае студэнтаў вучыцца настойліва, упарта, цярпліва.

Арыгінальную прамову гаворыць затым малады выкладчык, кандыдат гістарычных навук Г. Г. Герасіменка.

— Тут выступалі старэйшыя выкладчыкі, — гаворыць тав. Герасіменка, — ну а я, як кажуць, яшчэ не зусім адарваўся ад студэнтаў, бо не так даўно скончыў універсітэт, і ў старэйшыя мяне яшчэ неахвотна залічваюць. Я яшчэ жыву пад уражаннем студэнцкіх год і хачу вам параіць, дарагія першакурснікі, бярыцеся з першых дзён за кнігі, не марнуйце дарэмна час, даражыце ім. Цяпер вы студэнты. Вам не прыдзецца адказваць ля дошкі, як у школе. Але гэта не значыць, што можна кожны дзень не працаваць. Выклік будзе на семестровых экзаменах. Рыхтуйцеся да гэтага выкліку ужо зараз, не адкладвайце на заўтра тое, што можна зрабіць сёння.

Выступае студэнтка 5 курса філалагічнага факультэта В. Бандацкая. Вы прыйшлі сюды, гаворыць яна, з калгасных палёў, з радоў Савецкай Арміі і ад станкоў. Я горача віншую вас з ажыццяўленнем запаветнай мары. Радзіма падарыла нам гэтыя светлыя вучэбныя карпусы, дала ўсё, каб мы вучыліся. Ва ўдзячнасць за гэта мы павінны настойліва і старанна вучыцца.

Хвалюючыся да трыбуны падыходзіць першакурснік — гісторык М. Янушкевіч. Ён горача дзякуе роднай партыі і ўраду за выдатныя ўмовы для вучобы і ад імя ўсіх студэнтаў першага курса запэўняе ўсіх прысутных, што яны будуць вучыцца так, як завяшчаў Ільіч. Гэтыя словы тонуць у гарачых апладысментах. Бура апладысментаў успыхвае з новай сілай, калі першакурснікі падносяць букеты цудоўных руж прафесарска-выкладчыцкім работнікам, сваім старэйшым сябрам.

---

*З цаліны*

## Гарачыя цагліны

Хутка ходзяць вопытныя рукі муляра. Дакладны кароткі ўзмах, і цагліна, бы ўпаяная, кладзецца ў сценку. Усё часцей Расціслаў Жаўняк адрывае погляд ад кладкі і неспакойна пазірае на сцэпавую дарогу. Невялікая куча цэглы ля сцяны стала ўжо зусім маленькай, а машын усё няма.

Падышоў прараб, развёў рукамі, ціха і вінавата паведаміў:

— Цэглы не будзе. На заводзе не паспяваюць абпальваць.

Задуміва пачухаў патыліцу, дадаў:

— Адна печ ужо гатова, але разгрузяць яе толькі ўвечары.

— А чаму цяпер нельга? — спытаў Жаўняк.

— Печ яшчэ не астыла.

— Хлопцы! А што калі нам паспрабаваць усё ж, а? — абвёў поглядам сваіх таварышаў брыгадзір.

Яны зайшлі ў цэх. Гарачая хваля ўдарыла ў твар. Слупы цэглы дыхалі спёкай...

— Частка застаецца ў печы, астатнія — знадворку. Мяняцца мецамі праз кожныя пятнаццаць хвілін,—распарадзіўся брыгадзір.

Праз хвіліну ў кузаў кляліся першыя цагліны. А праз пятнаццаць — з печы, бы з пекла, выйшлі першыя «д'яблы». На тварах, пакрытых слоем жоўтага пылу, блішчэлі толькі вочы.

— Як там, у пекле? — пажартаваў нехта з грузчыкаў.

— Нічога! Жыць можна, —усміхнуўся «д'ябал», змахваючы пыл з твару...

**Саўгас імя Фрунзе. Матфак.**

---

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок,
галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02532. Тыр. 2000 Зак. 3369.